Пятроўская Р.М.,
выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ САЦЫЯЛЬНАГА ПЕДАГОГА Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ РАЗДЗЕЛА "РЭЖЫСУРА НУМАРА"

1. У.І.Немiровiч-Данчанка гаварыў, што сучасны мастак павiнен быць сацыяльна-адукаваным чалавекам. Пад гэтым ён разумеў шэраг навыкаў зносiн з людзьмi, этычных патрабаванняў да сабе i да людзей, законаў маралi, рэальных норм паводзiн, шэраг спецыяльных абавязкаў i стымулаў чалавека, якi разумее, у якую эпоху ён жыве, куды ён хоча накiроўваць сiлу свайго мастацтва, свайго таленту.

Узняцца на такi ўзровень вельмi цяжка. Патрэбна мець свой погляд на ўсё, што адбываецца. А.Д.Папоў пiсаў: "...сапраўдная творчасць "Я" - гэта заўсёды i найперш за ўсё гарачае пачуццё, натхнёнасць, самастойны погляд на жыццё". Вось гэты "самастойны погляд на жыццё" i павiнен фармiравацца ў студэнтаў у працэсе авалодання навыкамi рэжысёра нумара. Перш чым увасобiць на сцэнiчнай пляцоўцы кавалак чалавечага жыцця, трэба чалавека разумець, зiрнуць на яго i з боку, i з сярэдзiны, разабрацца ў матывах яго паводзiн, пранiкнуць у яго настрой, навучыцца суперажываць, спачуваць.

2. Акрамя гэтай, на наш погляд, галоўнай якасцi рэжысёра i педагога, студэнты ў працэсе заняткаў авалодваюць цэлым шэрагам прыёмаў i метадаў рэжысуры ў рабоце з малымi формамi драматургii, г.зн. нумарамi, як часткi мастацкай праграмы. Калi студэнты ствараюць глядзельныя нумары: песнi, байкi, вершы, iнсцэнiроўкi, жарты, то яны найбольш поўна авалодваюць метадамi тэатралiзацыi, вучацца разважаць вобразамi, знаёмяцца з прыёмамi-сiмваламi, метафарай, алегорыяй. Iнсцэнiруючы лiтаратурны матэрыял (напрыклад, апавяданне, гумарэску), вучацца паважаць аўтара i беражлiва адносiцца да яго задумы, г.зн. працаваць у "сааўтарстве", умець перавесцi лiтаратурны матэрыял на сцэну.

3. Нумар характарызуе багацце выразных сродкаў, i таму ёсць магчымасць найбольш поўна пазнаёмiць студэнтаў са многiмi жанрамi мастацтва: моўным, музычным, пластычным, арыгiнальным, змешаным i iншымi. Палiтра жанраў маленькага нумара, якi мае сваю завершаную структуру, дапамагае набыць навык дакладнага адчування жанру i ўваходжання ў яго. Працуючы з гумарыстычным i сатырычным матэрыялам, ствараючы скетчы, iнтэрмедыi, клаунаду, студэнты знаёмяцца як з багаццем лiтаратурнага матэрыялу, так i з разнастайнасцю спосабаў i прыёмаў яго падачы. У рабоце над пастаноўкай дапамагае зразумець ролю методыка рэжысуры, а таксама развiваецца iнтэлект, выпрацоўваецца асацыятыўнае мысленне. Выкарыстанне такiх прыёмаў, як сiмволiка, метафара, алегорыя, адкрывае студэнтам цэлы свет сцэнiчных вобразаў, выхоўвае густ, дапамагае зразумець ролю кантрастнасцi выразных сродкаў, якiя маюцца ў рэжысуры ад лубка i скетча, ад iмправiзацыйна-скамарохавых гульняў да зладжаннага пластычнага эцюда, ад Пятрушкi да тэатра масак, жартавання над думкамi, якiя страцiлi надзённасць. Усё гэта стварае ў студэнтаў iмунiтэт супраць штампаў.

4. I як творчую справаздачу, вынiк работы на iндывiдуальных i самастойных занятках студэнты прадстаўляюць на iспыты нумар, якi задуманы i ўвасоблены ў сцэне, дзе кожны ўдзельнiчае i ў сваёй рабоце, i ў рабоце сакурснiкаў. Узбагачаючы сацыяльнага педагога прыемамi i метадамi рэжысуры малых форм, мы ратуем яго ад сумных i шэрых рамесiцкiх праграм.

Шаўцоў А.П.,
выкладчык

## АНАЛIТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА АЙЧЫННАЙ СIСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКI КАДРАЎ У ВНУ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

1. На сучасным этапе развiцця беларускага грамадства праблема рэфармавання сiстэмы вышэйшай адукацыi i падрыхтоўкi новых кадраў набыла велiзарнае i надзённае значэнне. Сёння для ўсiх вiдавочна, што iснуючая сiстэма не задавальняе патрэб грамадства ў прафесiйна падрыхтаваных спецыялiстах, i таму паўстае пытанне аб пошуку шляхоў яе рэфармавання i новых падыходах да распрацоўкi сiстэмы падрыхтоўкi кадраў у ВНУ.

2. Для вызначэння шляхоў рэфармавання ВНУ найперш трэба прааналiзаваць цяперашнi

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іх стан. Для гэтага неабходна:

а) пераасэнсаванне мінулага вопыту з аналізам станоўчых і негатыўных рыс існуючай сістэмы;

б) высвятленне патрэб грамадства ў неабходнасці будучых спецыялістаў.

3. Аглядаючы мінулы шлях развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі, можна сказаць, што ў пачатку стварэння, а потым і развіцця ў яе былі закладзены прагрэсіўныя асновы для падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Знішчэнне саслоўных умоўнасцей, магчымасць роўнага атрымання адукацыі, яе бясплатнасць, дэмакратызм - усе гэтыя фактары ў сукупнасці далі велізарны эфект. У 20-я гады на Беларусі развівалася шырокая сетка ўстаноў не толькі сістэмы сярэдняй адукацыі, але і закладваўся падмурак сістэмы вышэйшай адукацыі. Па ўсёй рэспубліцы ствараліся інстытуты, у 1922 г. адчыніў свае дзверы універсітэт у г.Мінску, куды прыйшлі здольныя, таленавітыя людзі, што пазней склалі касцяк беларускай інтэлігенцыі.

4. Далейшыя варункі функцыянавання сістэмы вышэйшай адукацыі аказаліся неспрыяльнымі. Адбыўся паварот ад першапачатковых прынцыпаў, сістэма улады занялася насаджэннем ідэалагічных догмаў у гэтай сферы, у выніку чаго ў ёй пачалі развівацца негатыўныя з'явы. На сённяшні дзень, калі падсумаваць сказанае вышэй, крызіс грамадскага і дзяржаўнага жыцця, які раней ствараўся штучным шляхам, а цяпер працягвае стварацца ў яшчэ болей страшэнных і пачварных формах, даў толькі адзін плён. Ён паказаў, наколькі існуючая дзяржаўная сістэма, у тым ліку і сістэма вышэйшай адукацыі, закасцянела і з'яўляецца кансерватыўна зацыкленай і няпуткай. Мы лічым, што прычынамі такога становішча з'яўляюцца як знешнія, так і ўнутраныя фактары гэтай праблемы.

5. Сістэма вышэйшай адукацыі, якая існуе цяпер на Беларусі, сутнасна застаецца старой, з'яўляецца асколкам былой савецкай сістэмы вышэйшай адукацыі з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Па-першае, падгонка ўсіх пад адзін стандарт, без уліку асаблівасцей краю, народа, падрыхтоўка спецыяліста з вызначанай накіраванасцю мыслення, з аднолькавым узроўнем ведаў - усё гэта робіць сістэму нежыццяздольнай і патрабуе карэннага перагляду канцэптуальных палажэнняў падрыхтоўкі кадраў у ВНУ ў новых абставінах. Аднабаковы падыход у вырашэнні ўсіх складаных праблем грамадскага жыцця прывёў да зніжэння ўзроўню выкладання ў ВНУ, да зніжэння ведаў студэнтаў, да звужэння кругагляду, што адмоўна ўплывае на працэс навучання.

6. Да ўсяго трэба дадаць таксама і крызісныя фактары ўнутранага развіцця ВНУ. Назавём некаторыя з іх:

а) накіраванасць у навучанні спецыялістаў толькі на спажыванне ведаў і інфармацыі;

б) неаднолькавы ўзровень патрабавальнасці да студэнтаў, што псіхалагічна разбэшчвае іх, бо дае магчымасць нешта недавучыць, недапрацаваць;

в) практыка "дацягвання" да выпуску ўсіх прынятых у ВНУ студэнтаў;

г) кадравае пытанне. Большасць цяперашняга выкладчыцкага складу ВНУ марудна ўспрымае новыя змены, прывучана працаваць па ўказаннях зверху, не праяўляючы ініцыятывы, што вядзе да зніжэння ўзроўню навучання.

7. І, нарэшце, аб другой умове рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі - высвятленне патрэб грамадства ў неабходнасці будучых спецыялістаў. Новыя кадры для грамадства патрэбны, як паветра, бо толькі спецыяліст, выхаваны на шырокім спектры поглядаў, лепшых узорах чалавечай думкі, нацыянальных традыцыях, незалежна мыслячы і крытычна настроены да жыцця, зможа адшукаць выйсце з агульнага крызісу.

Гаўрылішын І.П.,
прарэктар Кіеўскага інстытута турызму

## САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ СІСТЭМЫ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ КАДРАЎ ТУРЫЗМУ ЎКРАІНЫ ВА ЎМОВАХ РЫНКУ

Пры пераходзе на рынкавую мадэль эканамічнага развіцця адной з найбольш складаных праблем з'яўляецца стварэнне рынку працы. Як паказвае вопыт развітых краін, ён выконвае важныя функцыі ў сістэме ўзнаўлення працоўных рэсурсаў, павышае эфектыўнасць іх выкарыстання. Але ў той жа час немінуча вядзе да цэлага шэрагу негатыўных сацыяльных наступстваў, найбольш балючае з якіх - беспрацоўе.

Ствараючы новы гаспадарчы механізм, Ук-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ